Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Няхай жыве ордэнаносная Совецкая Беларусь!

Свята радасці і шчасця

11 ліпеня споўнілася 18 год з дня вызвалення Совецкай Беларусі ад белапалякаў. Гэты дзень з'яўляецца велізарнейшым святам для беларускага народу, днём радаснага лікавання і таржаства.

З пачуццём суровага гневу працоўныя ўспамінаюць аб жудасным часе панавання на нашай зямлі белапалякаў. Прэзрэнныя гады! Яны ў шалёнай нянавісці да народу пралілі мора чалавечай крыві. Яны палілі гарады і вёскі, забівалі старых і дзяцей, гвалтавалі жанчын, знішчалі сялянскія пасевы. Але не ўдалася крывавым тэрарам закабаліць беларускі народ, які ад усёй душы ненавідзеў акупантаў і змагаўся за сваё вызваленне.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і асабіста таварышоў Леніна і Сталіна гераічная Чырвоная армія ачысціла Совецкую Беларусь ад белапольскіх захопнікаў. Вялікі Сталін быў накіраван тав. Леніным, ЦК ВКП(б) для арганізацыі галоўнага ўдару па белапаляках. Лепшыя сілы партыі былі накіраваны на Заходні фронт. Верны саратнік таварыша Сталіна Серго Орджанікідзе, будучы членам Рэўваенсовета 16 арміі, асабіста ўдзельнічаў у цэлым радзе ваенных аперацый. Бясстрашны рыцар рэволюцыі Серго Орджанікідзе хадзіў у разведку ў тыл белапалякаў пад Барысавам. Пад напорам доблеснай Чырвонай арміі і партызан белапалякі былі разбіты і канчаткова разгромлены.

З таго часу прайшло 18 год. Якой непазнавальнай стала наша рэспубліка! Няма больш разаронай, прыгнечанай, жабрацкай Беларусі. Ёсць квітнеючыя гарады і вёскі, гіганцкія фабрыкі і заводы, выдатныя калгасы і соўгасы. Квітнее роўная сярод роўных адзінаццаці Совецкіх Соцыялістычных рэспублік Совецкая Беларусь.

За прайшоўшыя 18 год Совецкая Беларусь пад кіраўніцтвам ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна пры брацкай дапамозе вялікага рускага народу ператварылася ў рэспубліку соцыялістычнай прамысловасці і буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Толькі за годы двух сталінскіх пяцігодак у буйную прамысловасць БССР укладзена каля 850 мільёнаў рублёў. На месцы былых пустыроў у нас пабудаваны новыя фабрыкі і заводы з навейшай тэхнікай, як Магілёўская шоўкавая фабрыка, Касцюковіцкі шклозавод, Гомсельмаш, Белгрэс і многа другіх.

Радасна, заможна і культурна жывуць народы Совецкай Беларусі. Бесперапынна расце дабрабыт працоўных, расце зарплата рабочых і служачых, расце калгасны працадзень.

Наша сельская гаспадарка ўзброена перадавой тэхнікай. У БССР арганізавана 200 МТС, якія маюць 8141 трактар і 1200 камбайнаў.

А як велізарны поспехі БССР на культурным фронце! 1.110.700 дзяцей навучаецца ў пачатковых і сярэдніх школах. 16.000 студэнтаў навучаецца толькі ў вышэйшых навучальных установах.

Беларускі народ ведае, што гэта радаснае жыццё прынеслі яму вялікая комуністычная партыя і яе правадыр таварыш Сталін. Беларускі народ, як і ўсе народы Вялікага Совецкага Саюза, цесна згуртован вакол сваёй партыі, вакол свайго любімага правадыра і друга таварыша Сталіна.

Сваю адданасць да партыі і ўрада беларускі народ прадэманстраваў сотні і тысячы разоў. Асабліва яркай дэманстрацыяй гарачага патрыятызма да радзімы і яе правадыра былі незабыўныя дні выбараў у Вярхоўны Совет СССР і ў Вярхоўны Совет БССР. 99,19 процантаў з агульнай колькасці галасаваўшых аддалі 26 чэрвеня свае галасы непераможнаму блоку комуністаў і беспартыйных.

Беларускі народ ганарыцца тым, што першымі дэпутатамі ў свой соцыялістычны парламент абраны Вялікі **Сталін** і яго саратнікі таварышы **Молатаў, Варашылаў, Каганавіч, Калінін, Мікаян, Андрэеў, Ежоў, Жданаў.**

Тройчы прэзрэнныя ворагі народу трацкісцка-бухарынскія гады ўсімі сіламі імкнуліся падарваць магутнасць Совецкага Саюза і ў тым ліку Совецкай Беларусі. Праклятыя шаранговічы, галадзеды і другія хацелі адарваць Совецкую Беларусь ад Вялікага Совецкага Саюза, вярнуць і адзець на шыю працоўным Беларусі ярмо капіталістаў і памешчыкаў. Пралічыліся гады! Ніколі гэтаму не бываць! Слаўныя органы совецкай разведкі, кіруемыя жалезным наркомам, верным сталінцам тав. Ежовым, выкрылі і знішчылі гэту фашысцкую сволач. Беларускі народ актыўна дапамагаў, дапамагае і будзе дапамагаць слаўным наркамунудзельцам у выкрыцці ворагаў народу.

Жанчыны Совецкай Беларусі разам з мужчынамі штодзенна на справе даказваюць сваю гарачую любоў да радзімы. Уся краіна ганарыцца выдатным беспасадачным пералётам па маршруту Севастопаль—Архангельск, зробленым выдатнымі ваеннымі лётчыцамі Палінай Асіпенка, Верай Ламака і Марынай Расковай. Гэтыя бясстрашныя гераіні паказалі ўзор большэвіцкай мужнасці. Яны даказалі ўсяму свету, на што здольны совецкія жанчыны. Мы ганарымся і рады тым, што сярод гэтай адважнай тройкі ёсць дачка гомельскага рабочага, былая работніца Гомсельмаша Вера Ламака. Нашы жанчыны жадаюць на любым участку работы быць такімі-ж гераінямі.

18 гадавіну са дня вызвалення Беларусі ад белапалякаў мы сустрэлі напярэдадні ўборачнай кампаніі. Выдатны ўраджай гэтага года неабходна ўбраць па-большэвіцку, своечасова і без страт. Справай гонару кожнай калгасніцы павінна з'явіцца стаханаўская работа на полі.

Пад яркімі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі жывуць і працуюць працоўныя Совецкай Беларусі. Яны ніколі не забываюць аб тым, што фашысты рыхтуюць напад на нашу краіну. І ў любы час, па першаму закліку партыі і таварыша Сталіна беларускі народ гатоў стаць на абарону свайго шчаслівага жыцця.

На здымку. В. І. Ленін гутарыць з І. В. Сталіным у кватэры рабочага ў Петраградзе. 1917 г. Рысунак мастака П. Васільева. (Цэнтральны музей В. І. Леніна).

ПАВЕДАМЛЕННЕ тав. І. В. СТАЛІНА

АБ СУСТРЭЧЫ ПРАЦОЎНЫМІ МАСАМІ БЕЛАРУСІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ,

НАДРУКАВАНА Ў ГАЗЕЦЕ 16-й АРМІІ „ЧЫРВОНААРМЕЕЦ“ 15 ліпеня 1920 г.

ЯК СУСТРАКАЮЦЬ ЧЫРВОНЫЯ ВОЙСКІ.

„Член Рэўваенсовета рэспублікі таварыш Сталін паведамляе, што не можа не адзначыць зусім выключных адносін мясцовага насельніцтва да Чырвонай Арміі.

— Такіх адносін мне не прыходзілася сустракаць ні на ўсходзе, ні на поўдні.

Не гледзячы на беднасць сялянскіх мас на захадзе ў параўнанні з Паволжам і поўднем, усё-ж сяляне дзяліліся апошнім з чырвонаармейцамі.

Надзвычай цяжкая падводная павіннасць выконвалася без нараканняў.

Чырвонаармейцу аказвалася ўсякае садзейнічанне, усялякая дапамога, і вялікім было гора насельніцтва, калі мы былі вымушаны ў канцы мая пачаць адход.

Насельніцтва прыфрантовай паласы перанесла ўвесь цяжар польскай акупацыі, таму вельмі добра ведала, чым пагражае яму ўтаржэнне польскіх паноў.

На нашым фронце маецца цэлая група войск, уся санітарная справа якой знаходзіцца ў руках сялян і сялянак, праяўляючых велізарнейшыя клопаты і ўвагу да нашых раненых чырвонаармейцаў.

Што датычыцца настрою беларускіх сялян за франтавой паласой, то, па нашых звестках, там адбываюцца суцэльныя паўстанні, працуюць партызанскія атрады, разбураючы тыл праціўніка, спальваючы склады і знішчаючы памешчыкаў.

Можна смела сказаць, што паўтараецца тая-ж гісторыя, што ў Сібіры з Калчаком.

Пры набліжэнні нашых часцей усюды тыл праціўніка пачынае ўзрывацца знутры.

Мы прысутнічаем у цяперашні час пры сапраўднай сялянскай рэволюцыі ў Беларусі“.

1

З АРХАНГЕЛЬСКА, 2 ліпеня 1938 г.

Масква, Крэмль.

Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну

БЕСПАСАДАЧНЫ ПЕРАЛЁТ СЕВАСТОПАЛЬ — АРХАНГЕЛЬСК ВЫКАНАН ГАТОВЫ ВЫКАНАЦЬ ЛЮБОЕ ВАША ЗАДАННЕ

ОСІПЕНКА, ЛАМАКА, РАСКОВА.

З АРХАНГЕЛЬСКА, 2 ліпеня 1938 г.

Масква, Крэмль.

Таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Калініну, Кагановічу, Ежову.

З РАДАСЦЮ ПАВЕДАМЛЯЕМ АБ ВЫКАНАННІ ВАШАГА ЗАДАННЯ—БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЁТУ СЕВАСТОПАЛЬ—АРХАНГЕЛЬСК. ГАТОВЫ ВЫКАНАЦЬ ЛЮБОЕ ЗАДАННЕ ПАРТЫІ, УРАДА.

ОСІПЕНКА, ЛАМАКА, РАСКОВА.

АРХАНГЕЛЬСК.

Старшым лейтэнантам тт. Осіпенка, Ламака і лейтэнанту т. Расковай.

ГОРАЧА ВІТАЕМ СЛАЎНЫХ ЛЁТЧЫЦ тт. ПАЛІНУ ОСІПЕНКА, ВЕРУ ЛАМАКА І МАРЫНУ РАСКОВУ З ПАСПЯХОВЫМ ВЫКАНАННЕМ БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЁТУ НА ГІДРАСАМАЛЁЦЕ ПА МАРШРУТУ СЕВАСТОПАЛЬ—АРХАНГЕЛЬСК.

ГАНАРЫМСЯ МУЖНАСЦЮ, ВЫТРЫМКАЙ І ВЫСОКІМ МАЙСТЭРСТВАМ СОВЕЦКІХ ЖАНЧЫН-ЛЁТЧЫЦ, УПІСАЎШЫХ СВАІМ БЛІСКУЧЫМ ПЕРАЛЁТАМ ЯШЧЭ АДЗІН РЭКОРД У ГІСТОРЫЮ СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ.

МОЦНА ПАЦІСКАЕМ ВАШЫ РУКІ.

І. СТАЛІН
В. МОЛАТАЎ
К. ВАРАШЫЛАЎ
М. КАЛІНІН
Л. КАГАНОВІЧ
Н. ЕЖОЎ



На здымку (справа налева)—камандзір самалёта старшы лейтэнант П. Д. Осіпенка, другі пілот старшы лейтэнант В. Ф. Ламака і штурман-лейтэнант М. М. Раскова. Фота А. Грыбоўскага (СФ).

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні ордэнам Леніна

тт. ОСІПЕНКА П. Д., ЛАМАКА В. Ф. І РАСКОВАЙ М. М.

За паспяховае выкананне заданняў урада па беспасадачнаму пералёту Севастопаль—Архангельск на аднаматорным гідрасамалёце „МП-1“ і за праяўленую пры гэтым доблесць узнагародзіць ордэнам Леніна старшага лейтэнанта Паліну Дзянісаўну Осіпенка, старшага лейтэнанта Веру Фёдараўну Ламака і штурмана-лейтэнанта Марыну Міхайлаўну Раскову.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
15 ліпеня 1938 года.

ПАЛІНА АСІПЕНКА

Старшы лейтэнант, камандзір гідрасамалёта „МП-І“

НАШ ЭКІПАЖ

Думка аб палёце з Севастопаля ў Архангельск зарадзілася ў мяне ў 1937 г., пасля таго як мне ўдалася ўстанавіць тры міжнародных высотных рэкорда. Пастаянныя клопаты партыі і асабіста таварыша Сталіна аб нас, жанчынах-лётчыках, далі мне сілы дзярзаць у імя радзімы і совецкага народа. „Мяне падтрымаюць,—думала я,—мне дапамогуць ажыццявіць мару“. Захопленая сваёй ідэяй, я напісала рапарт наркому абароны маршалу Совецкага Саюза таварышу Варашылаву з просьбай дазволіць мне палёт.

Пасля гэтага я гутарыла аб палёце з армейскім камісарам 2-га ранга таварышам Мехлісам, які паведаміў мне, што таварыш Сталін ухваліў думку аб палёце і абяцаў падтрымку. Мне хацелася смяяцца і скакаць, як дзяўчынцы: цяпер я была ўпэўнена ў поспеху! Тысячу разоў у дзень я ў думках пасылала гарачыя словы ўдзячнасці дарагому правадыру.

Дні чакання скончыліся. Пачаліся будні, працоўныя, гарачыя, напружаныя: падрыхтоўка к палёту. Перш за ўсё трэба было падабраць экіпаж. Аб самалёце я думала не адна: аб ім клапаціліся таварышы, яго рыхтавала краіна. Што датычыцца экіпажа, маіх спадарожнікаў, то іх павінна была адабраць я—камандзір карабля.

Ляцець павінна было тры чалавекі: я, другі пілот і штурман. Прадстаяла падабраць невялікі, але стойкі, згуртаваны калектыў, кожны член якога павінен быў дасканала ведаць сваю справу, і акрамя таго, уладаць усімі якасцямі совецкага лётчыка: мужнасцю, смеласцю, здольнасцю перамагаць любыя цяжкасці.

У нашай краіне—нямала выдатных дзяўчат-лётчыц. Многіх з іх я ведала асабіста, з многімі разам працавала. Лепш другіх я ведала штурмана Марыну Раскову. Аб ёй выдатна адзываўся Герой Совецкага Саюза А. В. Белякоў, чыёй вучаніцай была Марына. Ён рэкамендаваў мне яе, як выдатнага штурмана, і хутка Марына стала членам нашага будучага экіпажа.

Трохі пазней я запрасіла другім пілотам лётчыка-скорасніка знішчальнай авіяцыі, старшага лейтэнанта Веру Ламака. Аб ёй вычэрпваюча гавораць яе ваенныя веды: старшы лейтэнант, старшы лётчык скораснай знішчальнай авіяцыі. Гэта—лётчык вышэйшага класа! Жанчын-скораснікоў у нас у Саюзе толькі некалькі чалавек. Мой выбар спыніўся на Веры Ламака, і яна, не вагаючыся, з энтузіязмам прыняла маю прапанову.

Мы пачалі рыхтавацца к палёту. Штодзённа сустракаючыся на рабоце, мы бліжэй пазнавалі адна другую. Так зарадзілася наша моцная дружба—дружба большэвікоў, забяспечыўшая нам перамогу. Разам з Верай мы вывучалі матор і матэрыяльную часць самалёта. Штурман Раскова вывучыла радыёсувязь, карты, трасу.

Пазней распачаліся трэніровачныя палёты: патрэбна было дасканала вывучыць марскую машыну, выдатна аўладаць тэхнікай сляпога палёта.

Нарэшце, усё было гатова. Я звярнулася да таварыша Варашылава з просьбай дазволіць старт. Нарком дазволіў. З бацькоўскай клапатлівасцю ён пісаў: „...яшчэ раз старанна праверце матэрыяльную частку. Жадаю поўнага поспеху“.

Праз некалькі дзён пачаўся палёт. Ён быў завершан, як вядома, праз 10 гадзін 33 мінуты пасля старта.

Што забяспечыла нам перамогу? Наш самалёт снаражала ў палёт магутная совецкая краіна. Мы перамаглі, бо мы—дочкі гераічнага совецкага народу, дзеці краіны, узброенай перадавой тэхнікай. Мы накіраваліся ў палёт з думкай аб тварцы шчасця чалавецтва—таварышы Сталіне. Яго імя натхняла нас на барацьбу, клікала да перамогі.

Наш калектыў перамог таму, што ён выхаван партыяй Леніна—Сталіна, а гэта выхаванне робіць з людзьмі цуды. Недарма ў нас спяваецца ў песні „Когда страна быть прикажет героем, у нас героем становится любой“.

Мы, радавыя лётчыцы, вышлі з народу і за шчасце яго гатовы аддаць сваё жыццё. Для нас няма перашкод! Кожнае сваё жаданне, калі яно ідзе на карысць радзіме, мы ажыццяўляем пры велізарнай дапамозе і падтрымцы народа, партыі, таварыша Сталіна. Мы жадалі быць лётчыкамі—і мы сталі імі!

Марына Раскова марыла аб палётах з дзіцячых год. Яна нарадзілася ў Маскве ў сям'і музыканта. Як і ўсе нашы дзеці, яна вучылася ў школе, скончыла дзевяцігодку і 16-гадовай дзяўчынай пайшла працаваць лабаранткай на завод, дзе выраблялі фарбы. Але дзяўчыну захапляла авіяцыя: Марына жадала стаць лётчыцай, усёй душой імкнулася да самалёта.

Быць лётчыкам—гэта значыцца пастаянна стаяць на варце граніц нашай радзімы, а што можа быць ганаровей для патрыётаў краіны Советаў?! Мару аб самалёце яна не пакінула і пасля таго, як выйшла замуж. Ужо будучы мацер'ю яна паступіла лабаранткай ў Ваенна-Паветраную акадэмію РСЧА імя Жукоўскага, каб быць бліжэй да авіяцыі. Хутка ёй удалася паступіць на аэранавігацыйны факультэт завочнага інстытута грамадзянскага паветранага флота.

Начальнікам лабараторыі ў акадэміі быў А. В. Белякоў, а ён-то ўмее бачыць і разумець людзей! Хутка ён даведаўся аб заветнай мары Марыны і аказаў ёй дапамогу і падтрымку, даў магчымасць практычна асвоіць штурманскую справу. Ён браў Марыну з сабой у палёты, навучаў яе, выхоўваў з яе штурмана.

Асвоіўшы штурманскую справу, але не атрымаўшы яшчэ звання штурмана, Марына атрымала адказнае заданне—правесці аэраграфічнае апісанне Чорнага мора. Заданне гэта яна выканала бліскуча і, атрымаўшы штурманскі дыплом, заняла пасаду інструктара лётчыкаў-назіральнікаў у акадэміі. У 1934 г. за выдатнае правядзенне палётаў

з слухачамі акадэміі яна была прэміравана: яе паслалі ў школу пілотаў для навучання лётнай справе без адрыву ад вытворчасці. Школу Марына скончыла ў 1935 г. і хутка ўжо ўдзельнічала ў жаночым групавым пералёце па маршруту Ленінград—Масква.

Пачалося самастойнае жыццё штурмана-пілота Марыны Расковай. Да 1937 г. яна працавала ў акадэміі інструктарам па слепых палётах. Пазней Марына ўдзельнічала ў скорасных гонках Масква—Севастопаль —Масква.

У 1937 г. яна ў якасці штурмана лятала з В. Грызадубавай на дальнасць па прамой на лёгкаматорным спартыўным самалёце. Тады быў устаноўлен рэкорд: самалёт праляцеў без пасадкі ад Масквы да Акцюбінска, пакрыўшы 1.443 кілометра. І вось цяпер Марына ў складзе нашага экіпажа зноў устанавіла рэкорд.

Такая адданая дачка народа—штурман самалёта „МП-1“ Марына Раскова.

Біяграфія другога пілота нашага карабля Веры Фёдараўны Ламака не менш яркая, чым жыццё Марыны.

Вера нарадзілася ў г. Омску ў сям'і рабочага-каваля. Бацька Веры—былы чырвоны партызан, член партыі з 1917 г. З малых год ён выхоўваў у дзяўчынцы лепшыя якасці совецкага чалавека—любоў да свайго народу, адданасць партыі Леніна—Сталіна, стойкасць і мужнасць, большэвіцкую ўпартасць у дасягненні мэты. З 1923 г. Вера пачала вучыцца ў школе, скончыла дзевяцігодку і пайшла працаваць на завод фармоўшчыцай.

Расказы бацькі аб гераічнай барацьбе нашага народу супроць белых і інтэрвентаў глыбока запалі ў душу Веры Ламака. Яна любіла слаўную Чырвоную армію, з захапленнем сачыла за ростам яе магутнасці і марыла аб тым, каб аддаць свае сілы ўмацаванню абароназдольнасці краіны. Яна хацела быць камандзірам Чырвонай арміі.

Веру пацягнула да самалёта. З дапамогай комсамольскай арганізацыі ў 1930 г. яна была ўжо ў ваенна-паветраным флоце, у школе лётчыкаў. Мара ажыццявілася. Дзяўчына імкнулася да вучобы, к аўладанню лётным майстэрствам, вучылася штодзённа, нястомна і горача. У 1934 г. яна скончыла школу, стала лётчыкам ваенна-паветранага флота. Але вучоба не скончылася. Вера вывучала ўсё новыя і новыя тыпы машын, вышэйшы пілатаж, сляпыя палёты. З дзяўчыны выпрацаваўся лётчык вышэйшага класа — лётчык-знішчальнік—скораснік. За рубяжом жанчын-скораснікаў няма ні ў адной краіне. Няма і не можа быць: за мяжой жанчынам закрыта дарога да такой ганаровай і грознай спецыяльнасці. У нас-жа жанчыне адчынены ўсе шляхі, яна—роўнапраўны грамадзянін. Толькі ў нашай краіне стала магчымым ператварэнне звычайнай дзяўчыны ў лётчыка-скорасніка знішчальнай авіяцыі, а па вайсковых ведах—старшага лейтэнанта ваенна-паветраных сіл РСЧА. Застаецца дадаць, што Вера Ламака—кандыдат у члены ВКП(б).

І нарэшце, камандзір карабля я—Паліна Асіпенка.

Я нарадзілася ў сяле Новаспасаўка, на Днепрапятроўшчыне, у сям'і селяніна-беднякa. Многа вучыцца мне не ўдалося: патрэбна было працаваць, дапамагаць сям'і. Скончыўшы два класы сельскай школы, я пайшла на заработкі, працавала прыбіральшчыцай, потым па сельскай гаспадарцы. У 1927 г. уступіла ў калгас.

Ішлі гады. Я працавала ў калгасе. Потым вучылася на птушкаводных курсах у Кіеве. Заўсёды імкнулася ісці ў нагу з жыццём, радасна і ахвотна ўдзельнічала ў грамадскай рабоце. У 1929 г. я ўпершыню ўбачыла самалёт, апусціўшыйся недалёка ад нашага сяла. Тады-ж я цвёрда рашыла:

— Буду лётчыкам!

Неўзабаве, імкнучыся ажыццявіць сваё жаданне, я паехала ў Севастопаль і там паступіла на работу ў сталоўку школы лётчыкаў. У гэты час я ўжо была членам партыі. Аб сваім жаданні вучыцца расказала камуністам школы. Яны дапамаглі мне, і пры садзейнічанні партыйнай арганізацыі я паступіла на вучобу ў лётную школу. Было гэта ў 1931 годзе. У вучобе мне дапамагаў інструктар тав. Лешко. Ён выхаваў з мяне лётчыка.

Нарэшце, вучоба была скончана. Я стала ваенным лётчыкам. Пацягнуліся яркія, поўныя гарачай работы дні і гады. Манеўры, вучэнні... Я заўсёды старалася быць лепшай, першай, і дзякуючы сваёй упартасці і дапамогі таварышоў часта дасягала сваёй мэты.

Цяпер я ўжо асвоіла многа тыпаў самалётаў.

Яшчэ ў 1935г. я стала займацца высотнымі палётамі, пачынаючы прыкладна ад 5.000 метраў і вышэй. Паднімалася ўсё вышэй і вышэй. Трэніравалася ў палётах на вышыню без кіслароднага прыбора і дасягнула да свайго паталка—7.200 метраў. У 1937 г. я ўстанавіла тры высотных рэкорды.

З усіх самых шчаслівых і дарагіх мінут майго жыцця самай радаснай была мінута сустрэчы з вялікім чалавекам нашай эпохі, з нашым бацькам і другам—Іосіфам Вісарыёнавічам Сталіным і яго бліжэйшымі саратнікамі ў 1936 г. на Усесаюзнай нарадзе жонак каманднага і начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Мне выпала вялікае шчасце выступаць на гэтай нарадзе. Таварыш Сталін слухаў мяне вельмі ўважліва. Ад хвалявання і радасці я гаварыла з цяжкасцю. Я-ж была ў сценах Крэмля! І я дала слова таварышу Сталіну, што буду працаваць яшчэ лепш, буду лятаць яшчэ вышэй, яшчэ далей.

Урад адзначыў мяне высокай узнагародай—ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Я дала слова павышаць свае веды, працаваць яшчэ лепш над умацаваннем магутнасці нашай радзімы.

У 1937 г. задумала ажыццявіць пералёт Севастопаль — Архангельск. Цяпер гэты пералёт ззаду. Уперадзе новыя, яшчэ больш адказныя палёты на славу радзімы, на славу партыі Леніна—Сталіна.

Мы ляцелі ад Чорнага к Беламу мору, натхнёныя клопатамі і ўвагай друга і настаўніка ўсіх працоўных—таварыша Сталіна, з думкай аб ім, з яго імем на вуснах.

Наш экіпаж выканаў цяжкую, але ганаровую задачу і гатоў у любы момант вылецець у новы рэйс па маршруту, які ўкажа нам таварыш Сталін.

Мы зрабілі свой пералёт у імя нашай квітнеючай радзімы, у імя ўмацавання магутнасці краіны соцыялізма, у імя шчасця чалавецтва і гатовы зрабіць любы подвіг—будзь гэта мірны палёт на дальнасць, на вышыню, на скорасць ці грозны рэйд на лагер ворагаў, якія адважацца напасці на нашу краіну.

(„Правда“)



Прарыў Будзённым польскага фронта. (З карціны мастака Авілава).

МАЕ ЎСПАМІНЫ

Ніколі не згладзяцца з памяці жахі ў часе белапольскай акупацыі.

І зараз, калі ўспамінаеш зверствы белапалякаў, стыне кроў у жылах. Жылі мы тады ў вёсцы Пасюты, Бярэзінскага раёна. У гэтай вёсцы жыла 20 яўрэйскіх сем'яў.

Аднойчы ў марозную студзеньскую ноч прачнулася вёска ад стрэлаў і крыкаў. Белапалякі акружылі вёску. З гікам і свістам насіліся па вёсцы. Хутка пачалі ламіцца ў хаты і выганяць яўрэяў на вуліцу. Выганялі ўсіх—і старых, і жанчын, і дзяцей. Нікому не дазвалялі застацца ў хаце. Праверыўшы, што нікога не засталося, нас 100 чалавек, як стада жывёлы, пагналі за вёску. Ніхто не ведаў, куды і для чаго ідуць. Тых, хто спрабаваў даведацца, білі плёткамі і шомпаламі.

Ішлі не па дарозе, а проста па снезе. Старыя і жанчыны ад стомленасці падалі. Іх паднімалі і зноў прымушалі ісці. Запомніліся жудасныя малюнкі. У адной жанчыны Прусак па дарозе памерла трохмесячнае дзіцё. Яна дзіка закрычала і ўпала на трупік свайго сына. Тут падышоў вусаты, п'яны легіянер, узяў мёртвае дзіцё за ножкі і, размахнуўшыся, далёка кінуў у поле, а маці доўга біў нагамі і шомпалам, пакуль не прымусіў яе падняцца і ісці. Гэты ўчынак азвярэлых бандытаў глыбока патрос усіх нас. Ад жаху і жудасці ніхто не мог сказаць слова. Толькі яшчэ шчыльней збіліся мы ў кучу, ахоўваючы сабой няшчасную маці.

Або такі факт. Цяжарная жанчына Шульман не магла далей ісці. Яе пачалі біць па жывату, а потым штыком пракалолі жывот, яна нарадзіла двух мёртвых дзяцей, а хутка ў цяжкіх муках сама памерла.

На стаянках пачыналіся здзекі. Хапалі дзяўчат і маладых жанчын і на вачах усіх гвалцілі. У старых вырывалі з крывёю бароды, не дазваляючы перавязваць раны. Ад здзекаў памёр стары Рыер і яго сын Эля. На адной з стаянак былі расстрэлены на вачах ва ўсіх Аўсей Грынблат і Міхель Шульман.

Праз два дні, прайшоўшы 60 кіламетраў, нас прыгналі ў вёску Перасады, Барысаўскага раёна, і тут пакінулі, строга забараніўшы варочацца дадому. Размясціліся, дзе хто мог. Жылі на чардаках і нават у аўчарнях. Так мы пражылі, пакуль Чырвоная Армія не вызваліла Беларусь. Мы вельмі рады былі, што скончыліся здзекі і забойствы, што мы можам паехаць у сваю родную вёску. Але там акрамя чорнага вугалю мы нічога не знайшлі. Усё было спалена і разгрbalена. Кожны з болем у сэрцы пакідаў родныя месцы і ехаў, куды мог, шукаць шчасця.

У роднай краіне хутка кожны з нас знайшоў сваё шчасце. Мы жывем багата і радасна. Мы бязмежна любім сваю радзіму, комуністычную партыю, правадыра тав. Сталіна. Мы гатовы да апошняй каплі крыві бараніць сваю бацькаўшчыну.

Я. І. Раяк

Барысаўскі раён.

ПЕРАВЫКАНАННЕМ ПЛАНА СУСТРЭЛІ СВЯТА

18 год назад беларускі народ пры дапамозе вялікага рускага народа ачысціў совецкую зямлю ад белапольскіх акупантаў.

Беларускі народ ведаў за што змагаўся. За прайшоўшы час наша рэспубліка стала непазнавальнай. Карэнным чынам змянілася яе аблічча. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка прывяла Беларусь да небачанага росквіту. БССР атрымала дзяржаўнасць. Яна стала роўнай з роўных у ззяючым сузор'і адзінаццаці брацкіх рэспублік.

У рэспубліцы выраслі сотні заводаў і фабрык, сотні цудоўных сталінскіх школ, універсітэтаў, тэатраў, бальніц.

Наша швейная фабрыка імя Крупскай таксама з'яўляецца дзецішчам сталінскіх пяцігодак. Яна пачала сваё існаванне ў 1930 г. Раней тут была саматужная арцель па вырабу цацак.

За гады двух сталінскіх пяцігодак фабрыка непазнавальна выросла. Яна ўвесь час механізавалася, прадукцыйнасць працы бесперапынна ўзрастала, памяншаўся брак, паляпшалася якасць прадукцыі. Узрастала і заработная плата рабочых. За восем год сярэдняя заработная плата ўзрасла ў тры з паловай разы.

Росту прадукцыйнасці працы і палепшанню добрабыту рабочых садзейнічаў стаханаўскі рух. Пачатак стаханаўскага руху быў перыядам індывідуальных рэкордаў, перавыканання існуючых норм выпрацоўкі. Ва ўсіх цэхах, лентах стаханаўцы дэтальна вывучалі прыёмы і метады работы, шукалі і знаходзілі новыя метады і ставілі адзін рэкорд за другім.

Ужо ў гэты час, яшчэ да перагляду норм, да перабудовы ўсяго вытворчага і тэхналагічнага працэсаў прадукцыйнасць працы рэзка ўзнялася. Асабліва выдатныя ўзоры работы паказалі стаханаўкі Брамброт, Зайцава, Райзарэвіч, Магіленка, Валчок, Асіпенка і другія.

Усе машыны на фабрыцы пераведзены на павышаныя скорасці. Зусім ліквідаваны ручныя працэсы, нават і такі, як ушыўка гузікаў. Устаноўлены спецыяльныя, самыя рознастайныя машыны, такія як зігзагі, мярэжачныя, электрапрэсы і г. д.

Зараз на фабрыцы налічваецца 463 стаханаўца.

За восем год фабрыка накапіла самае дарагое, самае каштоўнае—кадры рабочых, авалодаўшых тэхнікай вытворчасці, горача любячых і адданых сваёй радзіме партыйных і непартыйных большэвікоў. З 60 чалавек фабрыка выросла да 890 чалавек, з іх 760 жанчын. Многа работніц вылучана на кіруючыя пасады. Так майстрамі змен зараз працуюць тт. Рагозіна, Анюкоўская, Крыловіч. Майстрамі лент вылучана 29 чалавек, намеснікам дырэктара фабрыкі працуе былая работніца фабрыкі тав. Асташонак, старшынёй фабкома—тав. Голубева.

Гонарам усяго калектыва фабрыкі з'яўляецца былая работніца фабрыкі тав. Драгун, абраная зараз дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

Не дрэнна ў нас наладжана культурна-бытавое абслугоўванне рабочых. Ёсць інтэрнат на 400 чалавек (заканчваецца пабудова корпуса яшчэ на 70 чалавек), ёсць свой радыёвузел, клуб, кіноперасоўка, бібліятэка, парткабінет, яслі, піонерскі лагер. Уся моладзь (а яе на фабрыцы 85 проц. з усёй колькасці рабочых) ахоплена вучобай. Вельмі выросла за апошні час комсамольская арганізацыя. Яна налічвае зараз 160 чалавек.

Да 18 гадавіны вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў фабрыка прыходзіць са значнымі поспехамі. Поўгадавы вытворчы план выканан на 16 чэрвеня. І ўжо на 1 ліпеня выпушчана прадукцыі звыш плана на 365,5 тысяч руб. Сабекошт зніжан на 2,9 процанта, замест прадугледжаных планам 2 процантаў, у выніку атрымана эканоміі 150 тысяч руб. Прадукцыйнасць працы дасягае 115 процантаў.

У гэтым поўгоддзі мы паказалі не дрэнныя вынікі работы. Калектыў фабрыкі прыкладзе ўсе сілы і намаганні, каб выканаць задачу, пастаўленую перад намі партыяй і ўрадам.

Менск.

Р. Рутман—
дырэктар швейнай ф-кі імя Крупскай

У піонерскім лагеры фабрыкі „Комунарка" (Гарадзішча). На здымку: піонеры злева направа: Чарко Фіра, Айзенштат Фрыда, Зельманава Лена і Дзятковіч Ада. Фота Мазелева (СФ)

РАСЦЕ І МАЦНЕЕ



1. На станцыі Касцюкоўка, Гомельскай вобласці, узвышаюцца прыгожыя карпусы рабочага пасёлка шклозавода імя Сталіна. На тэрыторыі пасёлка разбіт прыгожы сквер і кветнікі. На здымку: выгляд рабочага пасёлка Касцюковіцкага шклозавода імя Сталіна. Фота Вэрнер (СФ)

2. Від фабрыкі імя КІМ (г. Віцебск). (СФ)

3. Пры Віцебскім аэраклубе перадавая моладзь фабрык і заводаў без адрыву ад вытворчасці авалодвае лётнай справай. На здымку: Т. К. Сініцына—дачка калгасніка, работніца друкарні без адрыва ад вытворчасці авалодала лётнай справай. Фота Пачкаева (БСФ).

4. Віцебскі педагагічны інстытут імя Кірава выпусціў 200 чалавек педагогаў. Усе выпускнікі накіраваны на работу ў сярэднія школы і тэхнікумы БССР. На здымку група студэнтаў-выпускнікоў Віцебскага педінстытута, атрымаўшых дыпломы першай ступені (злева направа) тт. Корхіна І. Л., Міньковіч Ф. Г., Іспенкоў А. М., Мінская Л. І., Свірцэўская М. М. Фота Пачкаева (СФ)









5. Работніца - стаханаўка Менскай швейнай фабрыкі „Кастрычнік" Александра Александраўна Зеленка цяпер вылучана дырэктарам Менскай швейнай фабрыкі „8 сакавіка". На здымку: (справа налева) т. Зеленка ў цэху гутарыць са стаханаўкамі Шнэйдэр Р. С. і М. П. Кабернік.
Фота Мазелева (СФ)

6. Калгаснікі калгаса „Чырвонай Арміі", Віцебскага раёна, атрымоўваюць больш 100 цэнтральных, рэспубліканскіх і абласных газет і многа розных журналаў, як „Новый мир", „Большэвік" і др. На здымку: Калгасны лістаносец тав. Дарошкін Г. С. (справа) раздае пошту калгаснікам.
Фота Пачкаева (СФ)

7. На здымку: Адпраўленне цягніка са станцы „Радостная" дзіцячай чыгункі „Малой Белорусской" г. Гомель. Фота Лапідуса (СФ)

8. На здымку: адпачынак працоўных у Чонкаўскім доме адпачынку. Фота Шаевіча (СФ)

Пачэсная справа

Багатыя ўраджаі ў гэтым годзе на калгасных палях Беларусі. Убраць гэты сталінскі ўраджай своечасова і добраякасна з'яўляецца пачэснай справай калгаснікаў.

Уборка ўраджаю ў самыя сціслыя тэрміны і правядзенне яе па-стаханаўску без страт будзе вялікім палітычным экзаменам для калгаснікаў, трактарыстаў, камбайнераў, ільнацерабільшчыкаў—усіх тых, хто ў той ці іншай меры звязан з уборкай ураджаю.

Я хачу падзяліцца вопытам сваёй работы, як камбайнерка, як я рыхтуюся да такой важнейшай палітычнай справы—уборкі ўраджаю.

У мінулым годзе я працавала на паўночным камбайне. Па норме мне патрэбна было ўбраць 80 гектараў. Заданне я перавыканала на 121 проц.—убрала 97 гектараў зернавых.

Спачатку 1938 г. перада мной паўстала адна адказная задача—падрыхтавацца да ўборкі так, каб гэты год азнаменаваць новымі, больш высокімі паказчыкамі ў сваёй рабоце. Падрыхтоўка ў першую чаргу заключаецца ў тым, каб своечасова адрамантаваць трактары, камбайны, загадзя праверыць, ці ўсё ў парадку, ці зможам на машыне працаваць без прастояў.

К рамонту камбайнаў мы прыступілі ў пачатку мая. Усіх камбайнаў у нашай Менскай МТС налічваецца сем. З іх пяць камбайнаў патрабавалі рамонту. Камбайны рамантавалі мы толькі ўдваіх, я і Наташа Жыдовіч, бо другія спецыялісты былі заняты на іншых работах.

Зімой рамантавалі трактары. Я была ў брыгадзе тав. Владыкі. Наша брыгада спаборнічала з другой брыгадай, і мы атрымалі пяршынства як па якасных, так і па колькасных паказчыках. Увесь рамонт мы закончылі к 21 чэрвеня. Зараз гатовы выехаць у поле.

У гэтым годзе я буду працаваць не на паўночным, а на паўднёвым камбайне. Па плану мне патрэбна ўбраць на ім 200 гектараў. Я ўпэўнена, што гэта заданне я перавыканаю.

Мне беларускі народ аказаў вялікае давер'е, абраў мяне дэпутатам у Беларускі парламент. Я прыкладу ўсе сілы, каб на практычнай рабоце па ўборцы сталінскага ўраджаю працаваць па-стаханаўску і быць у перадавых радах па барацьбе за заможнасць калгаснікаў, як гэта належыць абранніку вялікага народа.

Аказанае давер'е пастараюся з гонарам апраўдаць на любой рабоце, якая мне будзе даручана вялікай партыяй Леніна—Сталіна.



На здымку: Ольга Канстанцінаўна Шарко правярае якасць рэжучых часцей камбайна. Фота Мазелева (СФ).

Шарко Ольга—камбайнерка Менскай МТС, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

ГАТОВЫ ДА ЎБОРКІ

Высокі ўраджай чакаецца ў гэтым годзе па нашаму Жыткаўскаму сельсовету. Такіх ураджаяў мы даўно не бачылі. Перада мной, як старшынёй сельсовета, стаіць задача—аперацыйна кіраваць уборкай па калгасах, бываць непасрэдна на полі, у брыгадах, звеннях.

Што намі ўжо зроблена? Па кожнаму калгасу выпрацаван план уборкі і абмеркаван на калгасных сходах. Планы ўборкі даведзены да кожнай брыгады, звяна. Амаль кожны калгаснік ведае, дзе і што ён будзе рабіць. За брыгадамі і звеннямі замацаваны ўчасткі, на якіх будзе вытвараццa ўборка.

Усе патрэбныя на ўборцы сельскагаспадарчыя машыны даўно адрамантаваны. Па калгасах у нашым сельсовеце налічваецца 11 жняярак—усе яны гатовы, каб выйсці ў поле і пачаць уборку ўраджаю. Адрамантаваны таксама і складаныя малатарні. Малацьбу мы будзем праводзіць тут-жа ўслед за ўборкай. Сярпамі, косамі, граблямі калгасы таксама забяспечаны.

Уся работа па падрыхтоўцы да ўборкі праводзіцца на аснове разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва. Жыткаўскі сельсовет спаборнічае з Бродаўскім сельсоветам. Спаборніцтва мы яшчэ заключылі ў часе пасяўной, і ўзялі першынства.

Паміж калгасамі таксама разгорнута спаборніцтва. Калгасы „Зара соцыялізма“ і „VI З'езд Советаў“ спаборнічаюць з калгасам імя Сталіна. Калгаснікі калгаса імя Сталіна, пакуль што, па ўсіх паказчыках ідуць наперадзе. Калгаснікі калгаса „Чырвоная судоль“ спаборнічаюць з калгаснікамі калгаса „Чырвоны Кастрычнік“. Калгаснікі калгаса „Чырвонае селішча“ спаборнічаюць з калгаснікамі калгаса „Перамога“. Наперадзе. ідзе калгас „Чырвонае селішча“

Разгорнута спаборніцтва паміж брыгадамі і звеннямі. Трэба сказаць, што вельмі добра спаборнічаюць жанчыны. Яны самі падбіраюць звенні і дружна працуюць на любых участках. Па калгасах налічваецца шмат стаханавак і стаханаўцаў. Вось, напрыклад, стаханаўка Чэча Марыя на сенакосе замест нормы 0,50 гектара выпрацоўвала—0,75 і больш. У часе праполачнай выконвалі нормы на 200 з лішкам процантаў стаханаўкі; Адамейка Наста, Марфа Бурдыло, Сцепаніда Адамейка і другія. Трэба сказаць, што спаборніцтвам і стаханаўцамі мы як след яшчэ не кіруем. Спаборніцтва ў большасці мы правяраем толькі па зводках, якімі абменьваюцца калгасы паміж сабой. Належны абмен вопыту паміж калгаснікамі не наладжан.

У далейшай сваёй рабоце я прадугледзіла ў плане работу са стаханаўцамі. Буду праводзіць нарады па асобных пытаннях, запрашаць іх на прэзідыум сельсовета, будзем абгаварваць вынікі спаборніцтва. Гэта дапаможа і мне ў рабоце. Я буду мець значна большы актыў. Праўда, я і зараз маю чалавек 40, але гэтага мала.

У сваёй рабоце я зварачваю ўвагу на разгортванне палітыкамасавай работы. Гэту работу праводзяць комсамольцы і актывісты. У часе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР у нас працавала 56 агітатараў. Сярод іх выявіліся з радавых калгаснікаў вельмі добрыя арганізатары. Сярод жанчын лепшым арганізатарам была Мікуліч Зося—лепшая актывістка совета. Яна не толькі праводзіла агітацыйную работу, яна дапамагала арганізоўваць гурткі, правярала іх работу. У выніку добра арганізаванай агітацыйнай работы ўсе нашы выбаршчыкі, у колькасці 1350 чалавек, з вялікім уздымам галасавалі за блок комуністаў і беспартыйных.

Масава-агітацыйную работу па калгасах, брыгадах і звеннях мы не спыняем, а наадварот, замацоўваем па такому-ж плану і прынцыпу, як і ў часе падрыхтоўкі да выбараў. Для гэтай мэты агітатары і чытчыкі скарыстоўваюць абедзеныя перапынкі, дажджлівыя дні і праводзяць работу з калгаснікамі.

Я ўпэўнена, што з дапамогай актыва і ўсіх калгаснікаў мы ўборачную правядзем арганізавана, у тэрмін і без страт. Для гэтага ў нас ёсць усе ўмовы і магчымасці.

М. С. Балтынская—
старшыня Жыткаўскага
сельсовета. Барысаўскі раён.



У калгасе імя Чырвонай Арміі, Віцебскага раёна, шырока разгарнулася падпіска на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі. На здымку: сакратар камітэта комсамольскай арганізацыі калгаса І. Ф. Стрэленка (злева) перад выхадам калгаснай брыгады на сенакос праводзіць падпіску на новую пазыку. Фото Пачкаева (СФ).

ПАГРАНІЧНЫ ВАРТАЎНІК

Землі гэтыя насычаны крывёю лепшых сыноў беларускага народа. У гарачыя летнія дні 1920 г. на гэтых палях ішлі ўпартыя баі. Лясы палалі ад артылерыйскага агня; снарады, з грукатам уразаючыся ў зямлю, рабілі варонкі; кулі, нібы дакучлівыя пчолы, гудзелі над галавамі; дзесьці ўдалечыні, то заціхаючы, то зноў узмацняючыся, раздавалася „ура"; блішчэлі на сонцы пікі; гарэлі клінкі чырвоных кавалерыстаў, адважна кідаўшыхся ў атаку. Тут адбываліся апошнія баі за поўную свабоду беларускага народа, за вызваленне яго ад ярма белапольскай акупацыі.

Мудры Серго, пад кіраўніцтвам Сталіна, у сваім вагоне на станцыі Прыяміна распрацаваў план наступлення чырвоных часцей. Байцы ў адну з летніх начэй, фарсіраваўшы срабрыстую Бярэзіну, ішлі ўперад, не ведаючы перашкод, — змятаючы з дарогі белапольскую погань. Узяўшы 11 ліпеня Менск і вызваліўшы горад ад жудаснага панавання польскіх легіянераў, чырвоныя войскі пачалі далей цясніць іх, і паны, змазаўшы пяткі, без аглядкі ўцякалі далей ад жалезнага патока Чырвонай арміі.

Анастасія Мірава — пажылая жанчына, калгасніца адной прыгранічнай сельгасарцелі, назаўсёды запомніла баявы дваццаты год. З якой прагнасцю чакалі ў вёсцы чырвоныя войскі! Не толькі дзеці, але і пажылыя ўзлязалі на дрэвы і глядзелі, ці не відаць здалёк за гарызонтам доўгачаканых чырвоных сцягаў.

І аднойчы пад раніцу, калі ўся вёска не спала, чакаючы налётаў п'яных польскіх легіянераў, за ўзгоркам паказаліся запыленыя коннікі. На іх высокіх заточаных піках шамацелі ярка чырвоныя, колера крыві, сцягі. Ішла нераможная чырвоная конніца. Уся вёска высыпала на ваколіцу сустракаць пераможцаў. Дзяўчаты, прыбраўшыся, старыя з хлебам і соллю ў руках запрашалі стомленых байцоў на абед. Сярод другіх сустракала чырвоных воінаў і Анастасія Мірава. Тады яна была маладзей, глыбокая радасць асвятліла яе твар. Скончылася панскае ўладарства, незаконныя аборы, палявыя суды, бізун, катаванні, сярэдневяковыя ізуверствы. Скончыліся пакуты працоўнага беларускага народа, больш не прыдзецца сялянкам праліваць крыві і слёз ад панскіх здзекаў. Як не радавацца!

Было гэта 18 год назад. Каля вёскі, амаль ля самага ўскраю яе, легла граніца. Паласатыя слупы раздзялілі непраходнай мяжой два светы. У вёсцы, дзе жыве тав. Мірава, ужо даўно калгас. Квітнеючы, пагранічны. Межы больш не рэжуць калектыўнай зямлі. Квітнеюць палі, і сакавітыя каласы разыходзяцца букетам тонкіх іголак. Зямля быццам тая-ж. Вось і горка, што была раней, і раўчук, што ў разводдзе ператвараецца ў цэлую раку, і лясок за ўзгоркам. Але гэта толькі знадворна той-жа малюнак. Змянілася да непазнавальнасці жыццё ў гэтых мясцах. Ужо даўно забыліся аб мякіне, аб лучынах, аб лапцях. Пшанічны хлеб не зыходзіць са стала, носяць хромавыя боты не толькі маладыя хлапцы, але і старыя, якія ў апошнія гады і старэць перасталі. Разам з людзьмі зямля памаладзела. Аднавіліся хаты, праезжымі сталі вуліцы, заквітнелі сады каля хат, школа цешыць сваім выглядам.

На мануфактуру, на абутак, на гатовую вопратку—суконныя касцюмы, шоўкавыя плацці—вялікі попыт. Дзеці з чырвонымі гальштукамі. У многіх веласіпеды. У клубе лекцыі, кіно, газеты. Над драўлянымі дамамі высока ўзнімаюцца антэны. Добра чутны Менск і Масква.

Хоць і пажылая Мірава, але яна напоўнена воляй і жаданнем быць карыснай калгасу. Была-б маладзей—працавала-б з брыгадай. Але і так не лішняя ў калгасе тав. Мірава. Яна—вартаўнік у пагранічным калгасе.

Ночы на граніцы, хоць і ціхія,—часам бывае вецер і кусціка не пашавеліць,—але за цішынёй гэтай многае скрыта.

Вёска спіць. Зачынены стаўні, нідзе не відаць агенчыка. Заціхлі куры, сціхлі сабакі; ручаёк, які цячэ каля вёскі, і той, здаецца, заціх. Хто-ж не спіць? Не спіць вартаўнік. Захутаўшыся ў хустку, ходзіць Мірава па ўскраіне вёскі. К кожнаму шолаху прыслухоўваецца, за ўсім пільна сочыць.

Ноч вільготная, месяц за хмары схаваўся, выплыве і зноў знікае.

— Затрымаемся ці далей пойдзем?—пачуўся сіплы трывожны голас.

Мірава, каб быць непрыкметнай, прытулілася да высокага плота. Яна ўся настаражылася. Першаму адказаў другі.

— Адпачыць-бы не шкодзіла.

Думкі, як надакучлівыя пчолы, асільваюць вартаўніка.

— Паклікаць каго-небудзь,—яшчэ збягуць. Самой затрымаць,—але іх двое. Больш чакаць нельга.

Жанчына выходзіць з-за плоту ў тую мінуту, калі двое невядомых сабраліся адыходзіць.

Высокі—той, у якога быў ахрыпшы голас, спачатку разгубіўся, але хутка ўзяў сяброўскі тон і загаварыў.

— Што, бабка, на бліны не запрашаеш? Мы заплоцім.

— Можна і на бліны,—адказала жанчына.—А вы што тут робіце?

— Ды вось на вечарынцы былі, загуляліся і цяпер дарогу шукаем.

Нечакана, перамяніўшы тон, жанчына сур'ёзна запытала:

— А дакументы ў вас ёсць?

— Якія там дакументы,—сказаў высокі і сабраўся адыходзіць. Другі нацягнуў шапку і таксама падрыхтаваўся адыходзіць за першым.

Тады жанчына, затрымаўшы высокага за руку, цвёрда сказала:

— Паспрабуй крануцца! Закрычу, уся вёска на ногі стане.

— Маўчы, баба, грошай дам,—зноў павёў сваю тактыку высокі, потым ён захацеў вырвацца з чэпкіх рук жанчыны-вартаўніка, але было позна. На ваколіцы вёскі спыніўся конны раз'езд пагранічнікаў.

— Сюды, таварышы, сюды!—клікала Мірава.

Радавая совецкая жанчына выканала свой абавязак. Яна памятае жахі варварскай акупацыі. І яна, як і кожны з нас, жыцця не пашкадуе за сваю совецкую радзіму, за яе мірны спакой, працу.

Е. Садоўскі



Радасць маці

На старонках журнала я хачу падзяліцца сваёй радасцю. На працягу некалькіх год я цяжка хварэла, а зараз, дзякуючы клопатам партыі і ўрада, дзякуючы совецкай медыцыне і яе работнікам, я ажыла.

Справа пачалася так. У 1933 годзе я стала цяжарнай. Ад цяжарнасці ў мяне былі моцныя ваніты, і прышлося легчы ў бальніцу. Замест лячэння мне там зрабілі аборт, які аказаўся вельмі шкодным для майго здароўя. У 1936 годзе прышлося перайсці на інваліднасць.

Два разы пасля аборта перанесла выкідышы, і я ўжо страціла ўсякую надзею мець дзяцей. Аднак совецкія ўрачы вярнулі мне радасць мацярынства.

Перш за ўсё я ўдзячна доктару другой паліклінікі тав. Хволес. Не гледзячы на тое, што прафесар прызнаў хваробу маю невылячымай, без аперацыйнага ўмяшання, доктар Хволес старанна ўзялася за лячэнне і дабілася бліскучых вынікаў. Праз некаторы час я адчула сябе значна лепш.

Нядаўна я нарадзіла дачку, і адчуваю сябе вельмі добра. Я вельмі ўдзячна таксама работнікам генекалагічнага аддзялення клінічнага гарадка, у якой я ляжала некалькі месяцаў у часе апошняй цяжарнасці,—асістэнтам т. Кантаровічу і Рапапорт і доктар Харынай, а таксама сёстрам Сокалавай, Сакольчык і Рэзнік. Яны прынялі ўсе меры для майго выздараўлення.

Я выношу вялікую падзяку совецкаму ўраду за дэкрэт аб забароне абортаў. І самую большую падзяку я выношу таварышу Сталіну за вырошчванне совецкіх медыцынскіх кадраў, за штодзенныя клопаты аб працоўных жанчынах. Прыкладу ўсе сілы, каб вырасціць маю дачку стойкім большэвіком. Хутка я зноў вярнуся на работу. Абавязкова буду стаханаўкай. Я дачка былога чырвонага партызана, які загінуў у 1919 г. ад забойц-белапалякаў. Калі толькі патрабуецца, я таксама стану на абарону сваёй любімай бацькаўшчыны!

Матрона Якаўлеўна Драпеза

Менск.

ДРУЖНА ПАДПІСАЛІСЯ НА ПАЗЫКУ

Як толькі па радыё сталі перадаваць дэкрэт урада аб выпуску „Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі" (выпуск першага года) у нас у цэху адбыўся мітынг. Работніцы з вялікім уздымам сустрэлі гэта паведамленне і тут-жа пачалі падпісвацца на пазыку.

Старая работніца тав. Эржыцкая сказала:

— Запішыце мяне першай.

За ёй падпісаліся Галянская, Марозава, Гапэева і другія. Наша першая змена выклікала на соцспаборніцтва другую змену; другая выклікала трэцюю. Наш каробачны цэх на працягу адных сутак скончыў падпіску на пазыку. Агульная сума падпіскі па цэху перавышае 100 проц.

Падпіскай на пазыку мы яшчэ раз даказалі, як моцна згуртаваны вакол партыі Леніна—Сталіна, як горача любім сваю радзіму.

Шэвелева.

Нова-Беліца,
фабрыка „Везувій".

БЯЗДУШНЫЯ АДНОСІНЫ

Працуючы восем год акушэркай у вёсцы Леніна, Церахоўскага раёна, я ў сваёй непасрэднай рабоце моцна звязалася з калгасніцамі. Клопаты аб іх, аб будучых дзецях, з'яўляюцца маёй штодзеннай справай.

Пасля дэкрэта ўрада аб забароне абортаў і расшырэнні сеткі радзільных дамоў, я ўзняла пытанне аб прадастаўленні памяшкання для калгаснага радзільнага дома. Сельсовет для гэтай мэты даў часова памяшканне з двух маленькіх пакояў 3 на 3 метры. Я набыла два камплекты для пачатку работы. За гэтыя два гады праз радзільны дом прайшло 256 рожаніц.

Вось ужо роўна два гады, як я штодзенна абіваю парогі райздрава, сельсовета і праўлення калгаса, каб дапамаглі арганізаваць нармальную работу раддома. Але ўсюды дамяне адмахваюцца, як ад да кучлівай мухі.

Зусім немагчымыя ўмовы, у якіх я цяпер працую. Бялізны для рожаніц і дзяцей няма. Рожаніцы харчуюцца сухой стравай, якую прыносяць сваякі. На харчаванне грошай не адпускаюць. Хворыя, якіх трэба ізаляваць, знаходзяцца ў адным памяшканні з здаровымі рожаніцамі. На днях паступілі дзве рожаніцы, адна з тэмпературай 39°, а другая з дародавым крывецячэннем—і я іх вымушана была змясціць у адной палаце з усімі разам.

Адчуваючы вялікую адказнасць за становішча ў раддоме, я звярнулася яшчэ раз да старшыні сельсовета з чарговай заявай аб прадастаўленні большага памяшкання, якое можна было-б лёгка набыць з былога ліквідаванага соўгаса. Замест дапамогі ён іранічна сказаў: „Нараджалі з бабкамі і ўсё было добра, а то падумаеш .. яшчэ выгады патрэбны".

Такія бяздушныя адносіны да жанчыны-маці з'яўляюцца недапушчальнымі. Трэба рашуча пакончыць з гэтай агіднасцю.

Краўцова М.—фельчар акушэрка

Церахаў

ЗЯМЛЯ У ЯРМЕ

Нядаўна вышаўшая ў Варшаве кніга пісьменніцы Ванды Васілеўскай „Зямля ў ярме“ малюе становішча ў сучаснай польскай вёсцы. Высока ўзнімаецца над худымі палямі „палац“ зямельных магнатаў графаў Остржэньскіх, гаспадароў вакольных вёсак—усіх гэтых Калін, Грабовак і Мацьковых. Граф Остржэньскі трымае ў сваіх цэпкіх лапах не адну сотню сялянскіх сямействаў. Ён выціскае апошнія сокі з „шэрага быдла“. Графскія ляснікі і даязжачыя травяць сялян паляўнічымі сабакамі, б'юць злоўленых на графскай зямлі сялянскіх хлапчукоў, якія збіралі грыбы і ягады. На баку графа—дзяржаўная ўлада, паліцыя, узброеная сіла. Духавенства апрацоўвае паству, прапаведуючы „пакорлівасць“, займаючыся шпіёнствам і даносамі.

Кніга Ванды Васілеўскай раскрывае патрасаючыя малюнкі з жыцця і быту разораных, закабаленых капіталістычнай дзяржавай сялян, якіх фашысцкі рэжым асуджае на павольнае фізічнае знішчэнне. Васілеўская—дробнабуржуазная інтэлігентка. Яна баіцца рэвалюцыі. Яна гаворыць аб нарастаючым супраціўленні сялян графскаму самавольству, але не робіць натуральна выцякаючых адсюль палітычных вынікаў. Яна толькі фатаграфуе, прыводзіць факты. Але гэтыя факты выкрываюць усю жорсткасць эксплаатацыі кіруючых класаў Польшчы! Яны выкрываюць усю хлусню і ханжаства прадажных варшаўскіх „патрыётаў“, сумна бубнячых аб „кансалідацыі народных сіл“.

Кніга Васілеўскай—жывы, сапраўдны чалавечы дакумент. Яна перагукаецца з падзеямі сённяшняга дня. І калі чытаеш у польскім апазіцыйным друку аб безлічных катаржных прыгаворах правадырам сялянскіх стачак, аб расстрэлах сялянскіх дэманстрантаў,—перад вачыма ўстаюць героі аповесці Ванды Васілеўскай.

Аўтар кнігі з уласцівай людзям гэтага склада нерашучасцю ўнікае заглядаць наперад і праяўляе абсалютную бездапаможнасць там, дзе трэба прама сказаць: „Кіруючы лагер Польшчы гніе, ён прывёў краіну на край катастрофы, ён служыць інтарэсам германскага фашызма. Толькі ў бязлітаснай народнай барацьбе з гэтым ладам, толькі ў рэзультаце перамогі над ім магчыма зняць панскае ярмо з польскай зямлі“.

Ніжэй мы друкуем урыўкі з кнігі Васілеўскай.

I

... Летам паспявалі ягады, і кусты здаваліся чырвонымі,—так многа было маліны. Ягады былі буйныя, салодкія, пахнучыя лесам.

Калі сяляне ехалі за Буг на кірмаш, бабы злазілі з вазоў, каб назбіраць трохі ягад. Асцярожна азіраліся па баках, бо лес быў панскі і ягады былі панскія, хоць нікому з маёнтка і ў галаву не прышло-б прыйсці сюды. У іх у садзе было дастаткова маліны, ружовай і белай, дастаткова градак з клубнікай.

Збіраць ягады ў лесе было забаронена. Усюды шныралі ляснічыя: Станэк, Твардзіох і другія. Вартавалі. Не толькі дрэвы, але і кожную ягадку.

Гэта-ж яна была панскай...

Ляснічыя прадавалі карткі на права збору. За два злотых выдавалі білецікі. Але той, хто ў стане быў заплаціць два злотых, не цікавіўся грыбамі і ягадамі графаў Остржэньскіх.

Старога Матуса заўсёды ўпікалі. Кожны дзень нявестка папракала яго сухой скарынкай. Ён пасвіў скаціну, капаў бульбу, баюкаў дзіцё, і ўсё-ж лічылася, што ён дармаед. Не было граша на махорку. А пані настаўніца з Бучын, кажуць, купляе ягады, калі хто прыносіць. Дзесяць грошай за гаршчочак. Пятнаццаць грошай за гаршчок.

Да Бучын добрых дзесяць кіламетраў, але ў старога Матуса яшчэ моцныя ногі. Калі Матус убачыў, што маліна пачала паспяваць, ён ніяк не мог утрымацца.

Прабіраўся цішком у лес. За ім бег касматы сабака Філюсь. Ён быў раней бяздомным, потым прыстаў да дзеда. Куды Матус, туды і Філюсь. З ім Матусу было весялей.

— Бачыш, пёсік, якую ягаду паслаў пан бог. Збярэм самых лепшых цэлы гаршчок. А як сцямнее, паскочым у Бучын. Пані настаўніца дасць пятнаццаць грошай, купім сабе махоркі. Цэлую чверць. Чуеш?

Сабака віляў хвастом.

— Цэлую чверць. Маліна расце сабе як ні ў чым ні бывала. А мы яе збярэм, і будзе махорка.

Звярнулі ў густы ельнік. Тут было цёмна і ў ясны дзень. Пакрытая іголкамі зямля ціха скрыпела пад нагамі. Стары прыгнуўся: галіны балюча сцябалі яго па твары.

— Цішэй, цішэй, пёсік! Як-бы д'ябал ляснічага не прыслаў!..

Сабака ціха забрахаў. Матус прытрымаў яго, абхапіў яго шыю. Стаяў і прыслухоўваўся. Дзесьці чуліся галасы. Там збіраюць ягады?

Асцярожна пайшоў далей. Ельнік скончыўся. Матус спыніўся каля густа паросшых кустоў арэшніка. Стаяў і ўглядаўся ўдалечыню.

Без сумнення, гэта Станэк. За плячыма ў яго двухстволка. Ён штосьці крычаў стаяўшай перад ім жанчыне. Матус пазнаў яе.

— Бачыш, пёсік? Агата Століяр з дзіцем прышла. За ягадамі.

Жанчына плакала наўзрыд, выціраючы слёзы блакітным зліняным фартухом. Дзяўчынка су-

...агава ўхапілася за спадніцу ...аці.

Станэк падняў гліняны жбан. Чырвоным струменем пасыпаліся ў траву ягады. Ляснічы ...страсянуў жбан, пакуль не ...пэўніўся, што на дне не засталося ніводнай ягадкі.

— Бачыш, пёсік, бачыш,— шаптаў стары Матус.

Велізарныя, абутыя ў высокія боты ногі Станэка тапталі чырвоны вастравок ягад. Ляснічы ціснуў ягады. Аддаў жбан плачу...ай жанчыне. Усхліпваючы, ішла яна ў бок Калін. Сонечныя праменні, пранікаючы паміж верхавінамі дрэў, гралі на апухшым ад слёз твары. Учапіўшыся за спадніцу, плялася за маткаю дзяўчынка.

— Жбана не забраў, які ласкавы,—прабурчэў стары Матус. —Пачакаем, пёсік, пачакаем. Хутка ён пойдзе. А мы тады збярэм ягады. Не будзе-ж ён тут вечна тырчэць.

Але ляснічы не меў, відавочна, намеру адыходзіць. Ён забраўся туды, дзе было больш за ўсё суніц. Матус чуў, што ён стаіць там, за кустамі, і чакае. Дзень прыгожы, ягад багата. Можа хто-небудзь яшчэ сюды зазірне?

Сізы дымок узняўся над арэшнікам. Старога Матуса ўзарвала.

— Бачыш, пёсік? Курыць! А нельга-ж гэтай сволачы тут курыць! Сурова забаронена! А ўсё-ж курыць. І ніхто яму ўпоперак дарогі не стане. Ён тут пан, пёсік, а не мы! Калі ён стаў курыць, значыць, надоўга, тут застанецца. А там дома Агнешка шалее, што мы не варачаемся. Пойдзем, ці што? А можа быць, паглядзім, што робіцца на горцы, над возерам? Можа быць, там клубніка з'явілася? Надвор'е вунь якое...

Навокал—сосны, дубы. Магутныя, нерухомыя. Раптам пачуліся нейчыя шагі. Сабака ўздрыгануў і замёр. Матус спыніўся, як укапаны.

Прама супроць яго стаяў Твардзіох з вінтоўкай у руках.

— Ты чаго тут лазіш?

Стары хутка сцяміў, што гаршка пад палой світкі ляснічаму не заўважыць. Заспакоіўся.

— Іду да Радзюкоў.

— Да Радзюкоў? Чаго табе ў ...: трэба? Якія ў цябе справы? Сабака для чаго? Заб'ю сабаку— і толькі!

— Сабака сам за мной увязаўся. Зайцаў не будзе чапаць, ён яшчэ малады, дурны.

— Ведаю я такіх! Да Радзюкоў... А навакол чаму не пайшоў.

— Там вільготна.

— А тут забаронена.

— Я-ж дарогай іду.

— Дарога панская, праз панскі лес пракладзена. Праходзь, праходзь. Каб я цябе тут больш не сустракаў! Ведаю я такіх!

Стаяў на дарозе і доўга глядзеў услед Матусу. Краем вока стары заўважыў, што клубніка яшчэ няспелая. Нічога не зробіш,—трэба ісці да Радзюка. Сочыць здалёк ляснік пракляты.

Радзюк атрымаў пры парцэляцыі самы дрэнны ўчастак. Далёка ад вёскі, далёка ад халуп, на супроцьлеглым канцы возера. Ён карміўся рыбалоўствам, па начах таемна ад ляснічых паляваў.

— Кожны хоча жыць, пёсік, кожны хоча жыць,—шаптаў стары Матус.—На шыі ў Радзюка баба і пяцёра дзяцей...

Успомніў, што дома злуецца Агнешка. І для чаго толькі ён стараўся! Гаршчок пусты, ягад няма, ляснічыя вырастаюць як з-пад зямлі.

— Бачыш, пёсік, усё тут панскае. Панскі лес, і панскія ягады, і панская дарога. Трэба вараціцца другім шляхам... Будзе вельмі дрэнна, калі зноў наткнёмся на Твардзіоха.

З другімі бывала вельмі дрэнна. Ну, хоць-бы з тым-жа Радзюком.

Прама супроць яго стаяў Твардзіох з вінтоўкай.

Ішоў аднойчы пан Остржэньскі лесам. Радам—Станэк. Аглядалі дрэвы. Раптам убачыў пан Остржэньскі ў зарасніках сілкі. На снягу бачны былі сляды. Пайшлі па слядах. Налічылі многа сілкоў. Яны былі схаваны ў кустах, укрыты ў нізінах. Два зайцы папалі ў сілкі. Было холадна. Снег іскрыўся, хрумсцеў пад нагамі. Пан Остржэньскі ўпарты. Таго, хто расставіў сілкі, трэба злавіць, ён прыдзе сюды.

Сляды занясло снегам. Зайцы акасцянелі. Пан Остржэньскі ходзіць паміж дрэвамі, рукой стукае аб руку. Мароз робіцца ўсё мацнейшым, як звычайна к вечару.

І дачакаліся такі Радзюка. Неасцярожна ішоў селянін, не падазраючы небяспекі.

Абыйшлі ўсе сілкі. Радзюк быў бледы як мярцвяк. На твары пана Остржэньскага нічога нельга было прачытаць. Спакойна, голасна лічыў сілкі.

А потым сказаў:

— Выбірай, брат. Суд ці кара на месцы.

Пяцёра дзяцей засталіся ў халупе і з імі хворая жонка. Сялянская скура моцная і жорсткая, а ў судзе яшчэ невядома калі скончыцца справа. Выбраў Радзюк кару на месцы.

Чатыры гнуткіх арэхавых хлыста наламаў Станэк. Радзюка павалілі на снег. Пан Остржэньскі адлічыў дзвесце ўдараў.

Пан і Станэк пайшлі. А Радзюк доўга яшчэ ляжаў, уткнуўшыся тварам у снег. Потым на чацвяронках папоўз дадому. Капала на белы снег і замярзала цёплая чалавечая кроў.

— Дрэнна нам з табой, пёсік. Беднаму вецер заўсёды ў вочы дзьме... Вось і халупа наша. Здаецца, Агнешка стаіць на парозе. Уцякай, пёсік, а то і табе дастанецца. Камня не пашкадуе Агнешка.

II

...Неба пра'яснілася. Бура прышла нечакана і таксама нечакана знікла, быццам праваліўшыся ў возера.

Уздоўж возера ішоў Стэфан Зялінскі з Мацькова. Ішоў весела насвістваючы. Паглядзеў на люстраную паверхню возера. Хутка распрануўся і акунуўся ў студзяністую ваду. Холад пранізаў цела—ад пятак да галавы.

— Бр...

Па траве ледзь чутна прашамацелі шагі. Стэфан абярнуўся. Ляснік Валер з сабакам. Аўчарка нізка апусціла морду, ледзь не кранаючыся зямлі.

— Купацца ўздумаў?

— Ці гэта вам перашкаджае?

— Перашкаджае і не перашкаджае. Калі я гавару, што перашкаджае, значыцца, перашкаджае.

— Тады-б трэба было павесіць аб'яву, каб кожны ведаў.

— Ты мяне не вучы!

— А вы людзей не задзірайце.

— Вылазь з вады!

— Яшчэ што?—запытаў Стэфан і зрабіў шаг уперад. Халодны абруч узняўся вышэй, затрымліваючы дыханне.

— Вылазь, чуеш!

— Чую, не глухі.

— Выходзь!

— Выкупаюся, выйду.

— Вылазь!

Ляснічы схапіў длінны бізун, падбег к самому краю возера, размахнуўся... Раздаўся свіст. На гладкім белым целе выступіла багровая паласа.

— Вады табе шкада, хамская морда! Хадзі сюды. Выпей яе ўсю, да дна.

Валер пасінеў ад злосці. Падбег да складзенай на беразе вопратцы Стэфана.

— Не чапай, чуеш ты?

— Заткні глотку.

Здалёк паказаўся сабака. Велізарны, падобны на ваўка. За ім бег ляснічы Савяк.

— У морду яго, Андзіо, у морду! Хай вучыцца!

Зелінскі выскачыў з вады. Глуха завурчэлі абодва сабакі.

— Аддайце вопратку.

— Захочам—аддамо, не захочам—не атрымаеш.

Стэфан схапіў ляснічага за руку. Але ў гэты момант на яго галаву, на плечы пасыпаўся град жорсткіх удараў.

— Вучыся, хлоп, калі ляснік гавора, слухай! Рэкс, бяры яго!

Адным скачком сабака апынулася каля Стэфана. Белыя вострыя клыкі ўпіліся ў цела.

— Ооох!

— Зойка, бяры яго!

Разгублена азірнуўся навакол. Недалёка расла невысокая акацыя. Вырваў нагу з сабачай пасці і стрымглаў паімчаўся да дрэва.

— Рэкс! Зойка! Бярыце яго!

Стэфан чуў за спіной храп, цяжкае дыханне сабак, адчуваў цяплыню, ідучую ад іх моцных цел. Вось і дрэва. Падскочыў, ухапіўся за галіну. Кара разарвала скуру, у твар стукнула чымсьці цвёрдым. Падабраў ногі, каб не дасталі ашалелыя сабакі.

— Рэкс, Зойка, бярыце яго!

— Пашкадуй горла, пан Валер. Сабакі яшчэ па дрэвах не лазяць.

У паветры прасвішчэў камень, з сілай стукнуў у грудзь.

— Оох!

— Бачыш, бачыш! Дастанем цябе і тут, будзь упэўнен!

Круглымі ад жаху вачыма глядзеў Стэфан на леснікоў. Яны кідаліся, шалеючы. З вартаўнічай будкі, якая знаходзілася недалёка, прыбеглі двое дзяцей Савяка.

— Геня, Юзэк, збіраць каменні! Падаваць іх сюды. Пан Гарбарчук сюды, да нас. Птушка сядзіць на дрэве.

Аб'езчык наблізіўся, усміхнуўся ў вусы.

— Адам у раі, ці не так?

— Па галаве яго, хама, па галаве! Хай вучыцца.

Зноў свішчэлі каменні. Абсыпаліся збітыя лісты акацыі.

— Зміласцівіцеся, людзі! Што вы робіце!

— Ага, цяпер, скуліш! Раней ты інакш гаварыў! Юзэк, Генька, цягніце каменні! Жвавей! Там, ля берага, іх больш, чым тут.

— Людзі!

— Крычы, крычы, ніхто цябе усёроўна не пачуе!

Сабакі, як шалёныя, скакалі вокал дрэва. Савяк падышоў бліжэй.

— Злазь!

Залітымі крывёю, памутнеўшымі вачыма Стэфан агледзеў сабак.

— Сабакі...

— Сабак баішся? Злазь! Інакш...

Трапны камень трапіў у жывот. Стэфан істэрычна закрычаў.

— Злазь!

І зноў камень. Юзэк спраўна прыносіў іх цэлымі прыгаршчамі. У вачох у Стэфана памуцілася. Страшэнная боль устрасала унутранасці. Хацеў штосьці сказаць, але акрываўленыя вусны выцягнулі толькі некалькі нечленападзельных гукаў. Разняліся аслабеўшыя пальцы. Стэфан упаў сярод сабак, цяжка, як куль з мукой.

— Уставай! Рэкс, Зойка, не чапаць!

— Ён не варушыцца.

— Зараз заварушыцца, уздуй яго, пан Валер, як след.

Ляснік падышоў, але ўзняты бізун павіснуў у паветры. З вымазанага крывёю твара на яго глядзелі нерухомыя, шкляныя вочы.

— Пан Грабарчук...

Сабакі прыселі. Шэрсць іх скурчылася, зліплася.

Валер абцёр пот мокрай рукой.

— Памёр?

— Паглядзі сам.

— Чаму яму паміраць? Жывучы хамы... Не заб'еш, калі-б нават сам захацеў. Цяпер ачухаецца...

Узяў руку Стэфана. Пульса не было чуваць.

— Гэта ты, пан Грабарчук, крычаў: на мордзе яго, па мордзе,—плаксівым голасам пачаў Валер.

— Я? А хто на яго напаў, калі я яшчэ тут і не быў? Хто загадаў дзецям каменні збіраць? Можа быць, я?

— Не выкруцішся, пан Грабарчук, — умяшаўся, Савяк.— Трох нас было.

— Я і не выкручваюся. Адным хамам менш стала, падумаеш. Бачыў хто-небудзь? Ніхто...

Сонца ўзнялося высока. З трубы вартавой будкі цягнуўся дым.

— Што рабіць?

— У ваду яго, і канец.

— Знойдуць.

— Хай знойдуць. Скажу—утаніўся.

— Акрываўлены...

— Памыецца ў вадзе. Ну, Савяк, за ногі яго.

— Раз, два, гоп!..

Карысныя парады

Выдаленне плям, чыстка, мыццё і афарбоўка вопраткі і тканіны

Раней чым прыступіць да выдалення плямы з вопраткі, трэба ў якім-небудзь месцы зрабіць пробу, ці не ўплывае плямавыводзячы састаў на асноўную фарбу, якой афарбаван матэрыял. Часта пры вывадзе плям з матэрыяла, афарбаванага нетрывалымі фарбоўшчыкамі, плямавыводзячы састаў можа некалькі паслабіць фарбу матэрыяла. Такія пробы гарантуюць ад памылак.

Састаў для агульнай чысткі і выдалення плям ад супаў, соусаў.

У банцы, утрымліваючай адну шклянку гарачай вады, распускаюць чверць кавалка (каля 25 грамаў) туалетнага мыла. Мылу даюць трохі астынуць і прыліваюць да яго чверць шклянкі дэнатурата і 2 сталовых лыжкі нашатырнага спірту. Сумесь добра парамешваюць, пераліўшы яе ў бутэльку. Да гэтай сумесі даліваюць адну шклянку бензіну. Пасля чаго зноў добра перамешваюць. Невялікую колькасць гэтага саставу ўціраюць у плямы і, даўшы сумесі падзейнічаць некалькі мінут, змываюць яе цёплай вадой. Калі гэты састаў развесці трохкратнай колькасцю вады, то ім можна зрабіць агульную чыстку рэчаў.

Перад чысткай плацце добра вытрасаюць і вычышчаюць шчоткай, пасля чаго, разаслаўшы яго на стале, наносяць з дапамогай шчоткі плямавыводзячы састаў на пярэднюю частку плацця, штаноў, борта піджакоў і другія найбольш забрудненыя часткі плацця. Паступова састабам ачышчаюць усе часткі вопраткі. Пасля агульнай чысткі рэшткі плямавыводзячага састава выдаляюць чыстай мокрай анучкай. Ачышчаную рэч вешаюць для прасушкі, не выціскаючы яе. Поўсухую рэч прасуюць з левага боку ці праз анучку.

Тлустыя плямы выдаляюць сумессю бензіна з паленай магнезіяй. Абедзве састаўныя часткі бяруць у роўнай колькасці. Калі пры гэтым атрымаецца рэдкая кашыца, то ў сумесь дадаюць трохі паленай магнезіі (апошнюю можна набыць у аптэцы). Гэты плямавыводзячы састаў уціраюць у пляму і даюць яму прасохнуць. Праз некалькі мінут застаўшыся на матэрыяле белы парашок счышчаюць шчоткай. Пры застарэлых плямах ачыстку паўтараюць.

Гэтым-жа саставам можна чысціць белую футру, светлыя фетравыя боты, шляпы, скураны светлы абутак і т. д.

Плямы ад чарніл на белых і каляровых матэрыялах і скуры выдаляюць змываннем іх дэнатуратам.

З чыста белых тканін чарнільныя плямы выдаляюць, змываючы іх фіялетавай сумессю марганцава-кіслага калія (марганцоўка). Атрымаўшыяся пасля марганцоўкі бурыя плямы знішчаюць шчавелевай кіслатой, размяшаўшы некалькі крышталікаў яе ў чайнай лыжцы кіпятку. Замест шчавелевай кіслаты можна таксама карыстацца капустным расолам ці кіслым малаком. Ачышчаныя ад плям месцы замываюць цёплай вадой з невялікай колькасцю піццявой соды.

Плямы ад дзёгцю выдаляюць сумессю з аднаго яечкавага жаўтка і адной чайнай лыжкі шкіпідару. Гэты састаў уціраюць пры дапамозе кісці ці шчоткі ў пляму і даюць ёй высахнуць. Праз гадзіну засохшую скарынку знімаюць і прамываюць заплямленае месца цёплай вадой з мылам. У некаторых выпадках чыстку прыходзіцца паўтараць да поўнага выдалення плямы.

Некаторыя сарты дзёгцю можна выдаліць, прамываючы пляму дэнатуратам, да якога дадаюць трохі зялёнага мыла.

Плямы ад малака з шоўкавых матэрыялаў выдаляюць цёплым гліцарынам, пасля чаго ачышчаныя месцы змываюць цёплай вадой. З цёмных ваўняных матэрыялаў малочныя плямы выдаляюць саставам з 3 чайных лыжак нашатырнага спірту, 3 чайных лыжак дэнатурату і 1 чайнай лыжкі кухоннай солі.

З простых папяровых тканін малочныя плямы выдаляюць саставам з 1 чайнай лыжкі гліцарына, 5 чайных лыжак цёплай вады і 1 чайнай лыжкі нашатырнага спірта. Пры лінючых фарбах гэты састаў трэба ўжываць з асцярожнасцю, каб не паслабіць асноўную фарбу матэрыяла.

Плямы ад пладоў выдаляюць нашатырным спіртам, а пры белых тканінах дадаткова абрабляюць жавелевай вадой. Пасля выдалення плямы ачышчанае месца прамываюць цёплай вадой.

Плямы ад смалы выдаляюць мешанінай з 1 сталовай лыжкі шкіпідару, адной чайнай лыжкі дэнатурату і паловай чайнай лыжкі нашатырнага спірту.

Травяныя плямы выдаляюць нашатырным спіртам ці моцным воцатам. З белых матэрыялаў травяныя плямы выдаляюць жавелевай вадой.

Маковер.

„Работница"

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058; 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3695. Тыраж 10.550 экз. Галоўлітбел № 4809.

Здана ў друкарню 14/VII-38 г. Падпісана да друку 23/VII-38 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.

ЦАНА 20 кап.

070

НАРКОМПИЩЕПРОМ СССР

ГЛАВПАРФЮМЕР

Мой любимый набор!

ТЭЖЭ





Кольд крем

Ронд